# АРХИВ И ДОКУМЕНТ В КУЛЬТУРЕ, НАУКЕ, ОБРАЗОВАНИИ И ГОСУДАРСТВЕННОМ УПРАВЛЕНИИ

## ФОНДЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ У 1921–1939 гг.[1]

**В. М. Бароўская**

*Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»,*
*вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

У артыкуле даецца агляд крыніцавай базы па праблеме беларуска-польскіх культурных сувязей у 1921–1939 гг. шляхам супастаўлення архіўных матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) і дакументаў з расійскіх архівасховішчаў. Прыводзіцца спіс фондаў НАРБ, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб ўсталяванні, развіцці культурных сувязей паміж БССР і Польшчай у міжваенны перыяд, адбываецца апісанне і класіфікацыя асноўных відаў архіўных дакументаў. Даказваецца, што галоўнымі формамі двухбаковага культурнага абмену з'яўляліся кнігаабмен (на аснове фондаў Наркамасветы, Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта), кінаабмен (фонд Белдзяржкіно).

***Ключавыя словы:*** культурныя сувязі; крыніцы; Нацыянальны архіўны фонд.

## ФОНДЫ НАЦИОНАЛЬНОГО АРХИВА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ КАК ИСТОЧНИК ПО ИЗУЧЕНИЮ БЕЛОРУССКО-ПОЛЬСКИХ КУЛЬТУРНЫХ СВЯЗЕЙ В 1921–1939 гг.

**О. Н. Боровская**

*Государственное научное учреждение «Институт истории НАН Беларуси»,*
*ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

В статье дается обзор источниковой базы по проблеме белорусско-польских культурных связей в 1921–1939 гг. путём сопоставления архивных материалов Национального архива Республики Беларусь (НАРБ) и документов из российских архивохранилищ. Приводится список фондов НАРБ, содержащие информацию об установлении, развитии культурных связей между БССР и Польшей в межвоенный период, происходит описание и классификацию основных видов архивных документов. Доказывается,

[1] Даследаванне праведзена пры падтрымцы БРФФД у рамках праекта «№ Г24 ИП-009»

что главными формами двустороннего культурного обмена являлись книгообмен (на основе фондов Наркомпроса, Белорусской государственной библиотеки, Белорусского государственного университета), кинообмен (фонд Белгоскино).

***Ключевые слова:*** культурные связи; источники; Национальный архивный фонд.

## FOUNDATIONS OF THE NATIONAL ARCHIVE OF THE REPUBLIC OF BELARUS AS A SOURCE FOR STUDYING BELARUSIAN-POLISH CULTURAL RELATIONS IN 1921–1939

**Olga Borovskaya**

*The State Scientific Institution "Institute of History. National Academy of sciences of Belarus", Akademimic str., 1, 220072, Minsk, Belarus, borovskaya-olga@mail.ru*

The article provides an overview of the source base on the problem of Belarusian-Polish cultural relations in 1921–1939 by comparing archival materials of the National Archive of the Republic of Belarus (NARB) and documents from Russian archives. A list of NARB funds is provided, containing information about the establishment and development of cultural ties between the BSSR and Poland in the interwar period, a description and classification of the main types of archival documents is provided. It is proved that the maim forms of bilateral cultural exchange (based on the funds of the People's Commissariat for Education, the Belarusian State Library, the Belarusian State University), and film exchange (the Belarusian state cinema Foundation).

***Keywords:*** cultural connections; sources; National Archives Fund.

Культурныя сувязі БССР і Польшчы ў 1921–1939 гг., нягледзячы на шматлікія супярэчнасці ў палітычнай сферы двухбаковых зносін (праблемы ў выкананні артыкулаў Рыжскага мірнага дагавора, пачуццё варожасці і недаверу ў грамадстве і кіруючых колах абодвух бакоў), мела пазітыўную дынаміку развіцця. Нягледзячы на некаторы спад тэмпаў у 1927–1932 гг., выкліканы непаразуменнямі ідэалагічнага плана, культурныя беларуска-польскія кантакты міжваеннага часу мелі пэўную накіраванасць, вылучаліся стабільныя формы ўзаемадачыненняў (кнігаабмен, удзел у канферэнцыях і конкурсах).

Фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца значнай і каштоўнай базай для вывучэння гісторыі беларуска-польскіх узаемаадносін міжваеннага перыяду, у прыватнасці двухбаковых культурных сувязей. Аднак, неабходна канстатаваць, што архіўныя крыніцы Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі будуць толькі якасным дапаўненнем матэрыялам, якія ўтрымліваюцца ў расійскіх архівасховішчах. Асноўны масіў інфармацыі ўтрымліваецца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (ДАРФ) і Архіве знешняй палітыцы Расійскай Федэрацыі.

Дакументы фонда 5283 [Усесаюзнае таварыства культурных сувязей з замежжам (УТКС)] у ДАРФе ўтрымлівае вялізную перапіску ўпаўнаважаных УТКС, арганізатараў таварыстваў культурнага збліжэння з СССР у Польшчы, дзеячоў польскай навукі і культуры з кіраўніцтвам УТКС, а таксама з рознымі навуковымі і культурнымі ўстановамі. Тут маюцца звесткі аб паездках прадстаўнікоў навукі і культуры Польшчы, аб выставах, кнігаабмене, дэманстрацыі фільмаў і інш. Каштоўную частку дакументаў фонду складаюць дзённікі і зводкі аб дзейнасці УТКС, гадавыя справаздачы.

Савецка-польскія сувязі ў галіне навукі і культуры знайшлі адлюстраванне ў матэрыялах ф. 4459 (ТАСС), ф. 5508 (ЦК прафсаюза працаўнікоў мастацтва), ф. 5445 (СНК СССР), ф. 5462 (ЦК прафсаюзаў асветы). У іх утрымліваецца інфармацыя аб узаемадзеянні двух краін у адзначаных сферах, пратаколы пасяджэнняў, даведкі, справаздачы, перапіска з польскімі дзеячамі навукі і культуры. Вялікую цікавасць прадстаўляюць звесткі аб паездках савецкіх вучоных у Польшчу, пратаколы пасяджэнняў Камісіі па замежных камандзіроўках, якія захоўваюцца ў ф. А-2307 (Галоўнавука НКА РСФСР).

Вялікую цікавасць прадстаўляюць дакументы ф. 4, 04, Ф. 122 («Рэферэнтура па Польшчы»), якія захоўваюцца ў Архіве знешняй палітыцы Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). Яны даюць магчымасць асвяціць шэраг праблем даннай тэмы. Большая іх частка ўпершыню ўводзіцца ў навуковы зварот. Фонды АЗП РФ утрымліваюць справаздачы, дакладныя запіскі, інструкцыі, ноты, якія раскрываюць знаходжанне ў Польшчы дзеячоў савецкай навукі і культуры, іх удзел у выставах і з’ездах, якія адбываліся ў Варшаве і іншых гарадах. Гэтыя дакументы таксама дазволілі аўтару найбольш поўна прасачыць уплыў савецкага боку на арганізацыю і дзейнасць таварыстваў культурнага збліжэння і сяброўства з СССР у Польшчы, істотна дапоўніць карціну знаходжання Д. Ф. Жылуновіча, Г. І. Гарэцкага ў Польшчы ў 1926, 1927 гг.

У Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ) былі вывучаны матэрыялы з ф. 17 [ЦК УКП(б)]. Найбольш каштоўнай крыніцай з’яўляюцца пратаколы пасяджэнняў Камісіі па выездам за мяжу. Дакументы ф. 495 (Выканкам Камінтэрна) і ф. 538 (Міжрабпам), якія захоўваюцца ў гэтым архіве, дадаюць матэрыялы аб дзейнасці Таварыства сяброў Савецкага Саюза, знаходжання польскіх дзеячоў культуры на святкаванні 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў СССР. Цікавасць прадстаўляюць дакументы з ф. 142 (А. В. Луначарскі), які ўтрымлівае перапіску наркома асветы з прадстаўнікамі навукі і культуры Польшчы, савецкімі

вучонымі і майстрамі мастацтва. Дакументы РДАСПГ маюць вялікую навуковую значнасць, тым больш, што для даследавання савецка-польскіх культурных сувязей у 1920–1930-я гг. яны выкарыстоўваюцца ўпершыню.

У Расійскім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва (РДАЛМ) былі вывучаны фонды выбітных дзеячоў савецкай культуры — А. Таірава, П. Когана, С. Эйзенштэйна, Д. Вертава і інш. Тут маецца вялізны матэрыял аб гастролях савецкіх мастацкіх калектываў і паказе савецкіх фільмаў у Польшчы, сабраны водгукі савецкай і польскай прэсы на значныя падзеі ў гісторыі культурных сувязей. Акрамя таго, гэтыя фонды ўключаюць перапіску з майстрамі польскай культуры. Каштоўная інфармацыя ўтрымліваецца ў ф. 941 (Дзяржаўная Акадэмія мастацкіх навук), і ф. 645 (Галоўмастацтва НКА РСФСР).

У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) значную цікавасць для даследчыкаў савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду маюць матэрыялы фондаў 6 (ЦВК БССР), 7 (СНК БССР), 42 (Народны камісарыят асветы), 205 (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), 246 (Белдзяржкіно), 546 (Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна) і іншыя. Дакументы з згаданых фондаў можна ўмоўна падзяліць на дзве групы: заканадаўчыя крыніцы [пастановы ЦВК, СНК РСФСР (СССР), БССР і іншыя] і матэрыялы афіцыйнага справаводства (пратаколы пасяджэнняў, рознага кшталту міжведамственная перапіска, справаздачы і іншыя).

З фонда 42 (Народны камісарыят асветы БССР) цікавасць прадстаўляюць пратаколы пасяджэнняў ЦВК, СНК, Наркамасветы, дакументы б удзеле беларускіх дэлегацый у працы міжнародных канферэнцый, камандыровачныя пасведчанні. Пастанова СНК СССР «Аб дачы навуковым інстытутам і вышэйшым школам права непасрэдна набываць кнігі за мяжой» 16 сакавіка 1926 г., перапіска з акцыянерным таварыствам «Кніга» аб забеспячэнні бібліятэк рэспублікі замежнай літаратурай, праект палажэння аб Бюро кнігаабмену пры Прэзідыуме ЦВК СССР, статыстычныя звесткі па кнігаабмене з Польшчай стануць неабходнай базай па вывучэнні працэсу наладжвання кнігаабмену паміж БССР і Польшчай у 1921–1939 гг.

Перапіска Наркамасветы БССР з УТКС аб выдаўніцтве Беларускага бюлетэня, перапіска Наркамасветы БССР з Беларускім таварыствам культурнай сувязі з замежжам перапіска Наркамасветы з Упраўленнем упаўнаважанага НКЗС СССР пры СНК БССР аб выдачы службовых замежных пашпартоў беларускім вучоным, камандыраваных за мяжу для ўдзелу ў міжнародных кангрэсах і канферэнцыях, працы ў польскіх архівах і бібліятэках будуць добрым доказам усталявання навуковых сувязей паміж беларускімі вучонымі і польскай навуковай грамадскасцю.

З фонда 205 (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт) найбольшай інфарматыўнасцю па праблеме валодаць пратаколы пасяджэнняў рэктарату, вучонага савета, саветаў факультэтаў, дакументы аб міжнародным супрацоўніцтве: выпіскі з пратаколаў, справаздачы аб замежных камандыроўках, характарыстыкі В. Д. Дружчыца, У. І. Пічэты). Захаваліся дакументы, якія датычацца камандыроўкі ў Польшчу ў гэтыя гады вучоных з БДУ (У. І. Пічэта, В. Д. Дружчыц, К. Г. Рэйнард, А. М. Усцінаў і інш.). Прафесары і дацэнты ў мэтах развіцця сваёй навуковай працы і ўдасканальвання вучэбнага працэсу, а таксама прадстаўлення рэспублікі і ўніверсітэта на міжнароднай навуковай арэне рэгулярна ажыццяўлялі творчыя камандыроўкі ў навукова-адукацыйныя цэнтры Польшчы. Летам 1923 г. У. І. Пічэта наведаў Германію, Літву і Польшчу, а з 1925 г. і 1927 г. — Польшчу, Літву, Чэхаславакію і Германію. У снежні 1925 г. ён прыняў удзел у з’ездзе польскіх гісторыкаў у Познані, дзе ў цэлым шэрагу дакладаў былі закрануты тэмы, якія непасрэдна датычыліся гісторыі Беларусі. Пры гэтым фінансаванне камандыровак адбывалася за кошт сродкаў Народнага камісарыята фінансаў БССР. Калі да 1929 г. камандыраванне вучоных адбывалася праз падачу хадатайства пэўнай арганізацыі ў Народны камісарыят асветы БССР, то пасля — праз Галоўнае ўпраўленне навукі і толькі пры ўмове, што тая ці іншая замежная паездка была ўключана ў зацверджаны пяцігадовы план [1, арк. 87–88].

З ліку фонда 246 (Белдзяржкіно) найбольш цікавымі з’яўляюцца пастановы, загады, цыркуляры, інструкцыі ЦВК і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР, ВСНГ СССР і БССР, Наркампрацы СССР, Дзяржаўнага Усесаюзнага кінафотааб’яднання «Саюзкіно», Упраўлення па справах фотакінаматаграфіі, «Белдзяркіно», справаздачы, дакладныя запіскі, даведкі, статыстычныя звесткі, перапіска аб арганізацыі кінасправы ў БССР, стане і развіцці кінасеткі і кінапракату на тэрыторыі Польшчы, аб пракаце і дэманстрацыі кінафільмаў. Савецкія кінакарціны, такія як «Браненосец Пацёмкін» С. Эйзенштэйна і інш., прайшлі значную цэнзарскую праверку, у выніку з фільма былі выразаны многія сцэны, якія, па меркаванні польскага боку, могуць «узбудзіць грамадскую думку бальшавіцкай прапагандай». У сваю чаргу УТКС канстатаваў, што «сістэматычнае польскай цэнзурай выхалашчванне і вычварэнства карцін савецкай прадукцыі ўводзіць у зман замежную грамадскасць і наносіць гэтым большую палітычную шкоду, якая ніяк не зможа быць апраўдана тымі нязначнымі выгадамі, якія мы маем ад продажу 2–3 карцін на польскім рынку» [2, арк. 11]. Кантанты ў галіне кінаматографу заставаліся аднабаковымі на працягу ўсяго міжваеннага перыяду. Аўдыёвізуальны кантэнт, які прапаноўваўся да імпарту польскай забаўляльнай індустрыяй, па меркаванні УТКС, цалкам не падыходзіў для новага пакалення савецкіх гледачоў, якія выраслі на масавым мастацтве

сацыяльнага рэалізму [3, арк. 39]. Таксама супрацоўнікі УТКС з гараччу канстатавалі, што антысавецкія кампаніі, якія разгортваліся ў прэсе, літаратурнае жыццё ў СССР прадстаўлялі ў вельмі негатыўным ключы.

Фонд 546 (Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна) утрымлівае спісы кніг, атрыманых бібліятэкай з-за мяжы ў 1930-е гг.; пратаколы савета па камплектаванні бібліятэкі, экспертна-закупачнай і фондавай камісій, дакументы аб міжнародным супрацоўніцтве ў галіне культуры паміж БССР і Польшчай у 1932–1934 гг. Так, у маі 1924 г. ЦВК СССР зацвердзіў «Палажэнне аб абмене афіцыйнымі выданнямі з замежжам», было арганізавана Міжнароднае бюро кнігаабмену, што садзейнічала абмену навуковымі выданнямі. Аднак кнігаабмен не адрозніваўся значным памерам: у 1924–1925 гг. было адпраўлена 305 выданняў з СССР у Польшчу і 28 кніг з Польшчы ў СССР. Тэхнічныя цяжкасці ўзнікалі з-за адсутнасці паштова-тэлеграфнай канвенцыі паміж СССР і Польшчай. Быў наладжаны абмен бібліяграфічнымі матэрыяламі: бібліятэка Варшаўскага ўніверсітэта і Інбелкульт у Мінску абменваліся спісамі літаратуры аб Польшчы, якая выходзіла ў СССР і якая выдавалася ў Польшчы аб СССР. У 1929 г. было пастаўлена пытанне аб стварэнні савецкага аддзела ў Варшаўскай публічнай бібліятэцы, а таксама аб забеспячэнні «польскіх дзеячоў, якія па-сяброўску адносяцца да СССР, літаратурай па адпаведных пытаннях» [4, арк. 41]. Характэрна, што за 10 месяцаў 1926 г. было накіравана ў Польшчу 1927 кніг і атрымана адтуль 3710. У 1928 г. Польшча ўжо займала ў кнігаабмене СССР з еўрапейскімі краінамі трэцяе месца па перасылцы і шостае месца па адпраўцы [4, арк. 193–194].

Архіўныя матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца найбольш каштоўнай крыніцай па вывучэнні беларуска-польскіх культурных сувязей у 1921–1939 гг. Пры сапастаўленні і спалучэнні дакументальнай часткі, сабранай у расійскіх архівасховішчах (ДАРФ, АЗП РФ, РДАСПГ і іншых), можна наблізіцца да аднаўлення гістарычнай рэчаіснасці двухбаковых адносін міжваеннага перыяду. Культурныя ўзаемадачыненні БССР і Польшчы ў 1921–1939 гг. прайшлі шлях ад этапу станаўлення праз перыяд больш ці менш значнай актыўнасці і амаль да поўнага спынення. Першыя два (1921–1927 і 1928–1932) этапы паказалі, што адрозненні ў сацыяльна-палітычных ладах БССР і Польшчы перашкаджалі развіццю культурных сувязей.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 42. Воп. 1. Спр. 274.
2. НАРБ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 166.
3. НАРБ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 237.
4. НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 295. Арк. 41.